"Соглашение сторон", по смыслу ряда статей трудового законодательства (стст. 64, 230, 238-3 КЗоТа), предполагает договоренность между нанимателем (администрацией) и общим собранием трудового коллектива, в крайнем случае — между нанимателем и профсоюзом.

В данном случае получается, что администрация предприятия нарушила ваши трудовые права, поскольку, не считаясь с мнением трудового коллектива, предоставила за работу в выходные и праздничные дни отгулы. Для защиты своих прав вы можете подготовить коллективное обращение к администрации предприятия и потребовать денежной компенсации. За оплатой своего труда работники могут также обратиться в комиссию по трудовым спорам (ст. 215 КЗоТа).

Вы хотите купить домик в деревне?

Существуют ли льготы на приобретение или постройку жилья при переезде на постоянное место жительства в сельскую местность?

Семья Кирилловых,
Минск.

Да, льготы такие существуют и создает их, как ни странно, сам президент, который в сентябре 1995 года раз и навсегда отменил "льготную" систему (см.: Указ №349 "Об упорядочении некоторых льгот для отдельных категорий граждан").

На этот счет действуют два указа президента: от 2 сентября 1996 года №346 "О некоторых мерах по развитию жилищного строительства на селе" (Збор дэкрэтаў, указаў прэзідэнта і пастаноў урада Рэспублікі Беларусь. 1996, №25, арт. 644) и от 3 марта 1998 года №98 "О дополнительных мерах по развитию жилищного строительства на селе" (Збор дэкрэтаў, указаў прэзідэнта і пастаноў урада Рэспублікі Беларусь. 1998, №7, арт. 160).

В первом указе облисполкомам разрешено продавать жилые дома (квартиры), построенные за счет бюджетных средств, предусмотренных на ликвидацию последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС, длительное время не заселенные жителями из районов, загрязненных радионуклидами, а также незавершенные строительством. А сельскохозяйственным предприятиям, основанным на собственности Республики Беларусь, разрешено с зачетом жилищной квоты продавать дома (квартиры) либо безвозмездно передавать их работникам этих предприятий, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий. Такие же операции можно проделывать и с незавершенным строительством.

В то же время колхозам, совхозам и другим сельскохозяйственным предприятиям рекомендовано продавать либо безвозмездно передавать работникам жилые дома (квартиры), не завершенные строительством, финансирование которых осуществлялось за счет средств этих предприятий и кредитов банков.

Указом предусмотрено множество других мер, направленных на развитие жилищного строительства на селе. В частности, граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в сельской местности и осуществляющие строительство индивидуальных жилых домов (квартир), могут рассчитывать на кредиты под залог строящихся жилых домов (квартир) в размере до 95% стоимости этого строительства сроком до 40 лет с началом погашения их через 3 года после получения и уплаты 5% годовых за пользование кредитами.

Указом от 3 марта 1998 года установлено, что гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим и работающим в сельской местности, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставляются одноразовые безвозмездные субсидии на строительство (реконструкцию) или покупку жилого дома (квартиры) в сельской местности в размере не менее 50% стоимости жилого помещения типовых потребительских качеств и при необходимости льготные кредиты в размере остальной части стоимости строительства (реконструкции) или приобретаемого жилого дома (квартиры).

По содержанию этих указов может сложиться впечатление, что строительство жилья на селе дармовое. Но не спешите менять город на деревню. Письма в адрес газеты свидетельствуют, что добиться льгот не могут сами сельские жители. А причина проста: у местных властей нет финансовых средств и других материальных ресурсов.

Семінар

Праца павінна быць не толькі карыснай, але і бяспечнай

Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб ахове працы, небяспечныя і шкодныя вытворчыя фактары, а таксама меры аховы ад іх — асноўныя тэмы двухдзённага практычнага семінара "Ахова працы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь", які пачынаецца 16 ліпеня ў Мінску. Ініцыятарамі яго правядзення сталі Мінскі гарвыканкам, Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва "Цэнтр XXI стагоддзе" і Навучальны цэнтр па павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

З дакладамі на семінары выступяць вядучыя спецыялісты Міністэрства аховы здароўя, Камітэта па працы, ваенізаванай пажарнай аховы. Для ўдзелу ў мерапрыемстве запрошаны кіраўнікі, юрысты, інжынерна-тэхнічныя работнікі, якія адказваюць за ахову працы на прадпрыемствах усіх форм уласнасці.

Валянціна МЕНШЫКАВА

Стоп-кадр

В заготовке ягод смородины, что началась на Гомельщине, активно участвуют те, кто состоит на учете в Гомельском центре занятости. В хозяйствах рассчитываются за работу ягодой. Кроме основных поставок смородины на Гомельский винодельческий завод, значительная часть ее будет реализована горожанам.

На снимке: *Наталье Сыропаровой сбор ягод нравится, да и заработок ее устраивает.*

Фото Сергея ХОЛОДИЛИНА, БелТА.

Армія

Цяперашняя прызыўная кампанія на тэрміновую ваенную службу завяршылася ў першай палове ліпеня

У адрозненне ад мінулых гадоў цяперашняя прызыўная кампанія на тэрміновую ваенную службу прайшла ў Беларусі ў адзін этап і завяршылася ў першай палове ліпеня.

Пра гэта журналістам паведаміў начальнік арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Галоўнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Міхаіл Каурын. Першапачаткова планавалася правесці прызыў у два этапы — з 22 чэрвеня па 10 ліпеня і з 10 па 20 жніўня. Аднак, на думку спецыялістаў, скарачэнне тэрмінаў прызыву садзейнічала эканоміі часу і сродкаў на абучэнне маладога папаўнення.

Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, усяго гэтым летам на тэрміновую ваенную службу ва Узброеныя Сілы рэспублікі прызвана каля 12 тысяч чалавек.

Алег САКАЛОЎ, БелаПАН.

Абітурыент-98

Падножка блату і хабару

Зацверджаны склад дзяржаўнай камісіі для ажыццяўлення кантролю за работай прыёмных камісій і правядзеннем уступных экзаменаў. У адпаведнасці з указам кіраўніка дзяржавы ад 29 чэрвеня №345, старшынёй камісіі з'яўляецца Мікалай Дамашкевіч — старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю, яго намеснікам — Уладзімір Русакевіч — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. У складзе камісіі кіраўнікі і супрацоўнікі цэнтральных і мясцовых органаў кіравання, вядучыя навукова-педагагічныя работнікі.

Прэзідэнт зацвердзіў таксама Палажэнне аб дзяржаўнай камісіі — нарматыўна-прававы акт, які засведчвае яе паўнамоцтвы, парадак утварэння, рэарганізацыі і ліквідацыі.

Як паведаміла БелТА прэс-служба кіраўніка дзяржавы, пры фарміраванні камісіі ўлічаны вопыт і ўрокі грамадска-дзяржаўнага кантролю за ўступнымі экзаменамі мінулых гадоў. Галоўная сацыяльна-палітычная задача камісіі — забеспячэнне аднолькавых магчымасцей абітурыентам пры паступленні ў дзяржаўныя вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, абарона іх правоў і законных інтарэсаў.

Члены камісіі маюць шырокія паўнамоцтвы. У прыватнасці, яны маюць права прымаць неабходныя меры па ліквідацыі недахопаў у рабоце прыёмных камісій і службовых асоб, забяспечваць няўхільнае выкананне ўстаноўленых правіл прыёму грамадзян у навучальныя ўстановы, папярэджваць парушэнні законных правоў і інтарэсаў абітурыентаў. Члены камісіі могуць прапаноўваць (рэкамендаваць) адміністрацыі навучальнай установы меры адказнасці да членаў прыёмнай камісіі за парушэнні дысцыпліны, арганізаванасці і законнасці, знаёміцца з асабістымі справамі абітурыентаў, прысутнічаць на ўступных экзаменах, пасяджэннях прыёмных камісій, сходах і кансультацыях абітурыентаў. Яны маюць права вывучаць думку абітурыентаў, іх бацькоў і грамадскасці па пытаннях арганізацыі і правядзення ўступных экзаменаў у мэтах павышэння эфектыўнасці кантрольнай дзейнасці, своечасова даводзіць да ведама прыёмнай камісіі і адміністрацыі навучальнай установы інфармацыйна-кантрольныя матэрыялы, якія патрабуюць аператыўнага рэагавання, ажыццяўляць аналітычны разбор канфліктных сітуацый, зваротаў абітурыентаў і іх бацькоў. Члены камісіі могуць ініцыіраваць незалежную экспертызу правераных пісьмовых экзаменацыйных работ, калі для гэтага ёсць важкія прычыны, каардынаваць дзейнасць прыёмнай камісіі канкрэтнай навучальнай установы з грамадскімі фарміраваннямі, якія ажыццяўляюць кантроль за выкананнем устаноўленых правіл правядзення ўступных экзаменаў. Ім прадастаўлена права размяркоўваць экзаменатараў па групах абітурыентаў у дзень правядзення экзаменаў, шыфраваць пісьмовыя экзаменацыйныя работы, разглядаць апеляцыі, скаргі і заявы абітурыентаў.

Кіраўнікам камісіі прадпісана аператыўна інфармаваць кіраўніка дзяржавы аб выяўленых недахопах у арганізацыі ўступных экзаменаў, аб парушэнні правоў і інтарэсаў абітурыентаў.

Уладзімір Русакевіч правёў пасяджэнне інфармацыйна-аналітычнай групы гэтага кантрольнага органа. Заслухана паведамленне першага намесніка міністра адукацыі Барыса Хрусталёва. Вызначаны задачы і асноўныя напрамкі дзейнасці гэтай групы. Яе членам рэкамендавана сканцэнтраваць намаганні на вывучэнні дзеючай сістэмы арганізацыі ўступных экзаменаў, вартасцей і недахопаў нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі, крытэрыяў ацэнкі экзаменатарамі здольнасцей і ведаў абітурыентаў. Група прадставіць кіраўніцтву камісіі заключэнне аб думцы абітурыентаў па пытаннях правядзення экзаменаў у кожнай навучальнай установе, характары апеляцый, скаргаў і заяў, рэагаванні прыёмных камісій на выяўленыя парушэнні ўстаноўленых правіл.

Ва ўсіх навучальных установах будуць арганізаваны пастаянна дзеючыя тэлефонныя лініі "Абітурыент-98" з тым, каб забяспечыць аператыўны разгляд зваротаў, заяў і апеляцый. Дзякуючы гэтаму кожны абітурыент будзе мець рэальныя магчымасці пагутарыць з прадстаўнікамі адміністрацый навучальных устаноў і членамі дзяржаўнай камісіі.

Па пытаннях работы прыёмных камісій можна звяртацца ў Адміністрацыю прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савет міністраў, Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства адукацыі. **Тэлефоны: 222-39-07; 222-69-03; 222-29-23; 220-31-37.**

БелТА.

Дэлегацыя беларускай моладзі можа не паехаць на Сусветны маладзёжны фестываль

Дэлегацыя беларускай моладзі можа не ўзяць удзел у Сусветным маладзёжным фестывалі, які пройдзе з 1 па 10 жніўня ў Лісабоне.

Плануецца, што ў фестывалі возьмуць удзел каля 6000 маладых людзей з 170 краін свету, а таксама прадстаўнікі органаў улады, еўрапейскіх структур, сродкаў масавай інфармацыі і г.д. На думку арганізатараў, Сусветны фестываль моладзі стане "адным з самых грандыёзных планетарных мерапрыемстваў апошніх гадоў".

Права фарміравання беларускай дэлегацыі для ўдзелу ў фестывалі прадастаўлена грамадскай структуры — Нацыянальнаму савету маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў, які аб'ядноўвае каля 25 арганізацый. Аднак, як паведаміла БелаПАН выканаўчы дырэктар маладзёжнага аб'яднання "Новая група" Вольга Нікіціна, не выключана, што беларуская дэлегацыя ў Лісабон не паедзе па вельмі банальнай прычыне — адсутнасці сродкаў.

Па словах В.Нікіцінай, прадстаўнікі Нацыянальнага савета звярталіся з просьбай аб аказанні фінансавай дапамогі ў Дзяржаўны камітэт па справах моладзі, аднак гэтае пытанне дагэтуль не ўрэгулявана. Сёння пагадзілася дапамагчы толькі адно турыстычнае агенцтва, якое выдзеліла ў якасці спонсарскай падтрымкі 1.500 долараў і прадаставіла аўтобус.

Аднак для таго, каб усё-такі паехаць на фестываль, неабходна яшчэ як мінімум 4.000 долараў, пошукам якіх і заняты зараз прадстаўнікі Нацыянальнага савета маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў. "Будзе вельмі шкада, калі Беларусь застанецца, як заўсёды, у баку", — заключыла В.Нікіціна.

Аляксей АРЭШКА, БелаПАН.

Пасля трохтыднёвага перапынку зноў узрос курс амерыканскага долара ў абменных пунктах камерцыйных банкаў Беларусі

На мінулым тыдні курс долара ЗША ў дачыненні да беларускага рубля працягваў узрастаць на ўсіх сегментах валютнага рынку, за выключэннем "чорнага" наяўнага.

Лідэрам росту стаў курс долара да безнаяўнага беларускага рубля на пазабіржавым рынку — 6,3 працэнта (з 66.500 — 68.000 да 70.000 — 73.000 рублёў). На мінскай Міжбанкаўскай валютнай біржы каціроўка амерыканскай валюты павялічылася на 2,3 працэнта (з 38.010 да 38.900 рублёў). Біржавы кошт нямецкай маркі павысіўся на 1,8 працэнта (з 20.900 да 21.270 рублёў), расійскага рубля — на 2,5 працэнта (з 6.080 да 6.230 рублёў), украінскай грыўны — на 5,8 працэнта (з 33.400 да 35.350 рублёў). Упершыню за апошнія тры тыдні ўзраслі каціроўкі амерыканскай валюты ў абменных пунктах камерцыйных банкаў — на 1,4 працэнта (з 50.000 — 54.000/55.000 да 50.000/51.000 — 55.000/56.000 рублёў).

На "чорным" рынку Мінска курс долара панізіўся за тыдзень на 0,8 працэнта (з 59.000 — 60.000 да 58.500 — 59.500 рублёў). Дарэчы, ужо ў панядзелак, 13 ліпеня, "чорны" курс узрос да 59.000 — 60.500 рублёў.

Разрыў паміж пазабіржавым і біржавым безнаяўнымі курсамі долара павялічыўся за тыдзень з 76,9 да 83,8 працэнта, паміж "чорным" і банкаўскім наяўнымі курсамі — зменшыўся з 13,9 да 12,9 працэнта.

З пачатку ліпеня пазабіржавы курс долара ўзрос на 5,1 працэнта, біржавы — на 3,2 працэнта, банкаўскі наяўны — на 1,4 працэнта, "чорны" наяўны" знізіўся на 1,3 працэнта.

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

Дайджест

Палестинские власти обвинили "Рейтер" в распространении "недостоверной информации"

В связи с этим была приостановлена деятельность информационного агентства в секторе Газа. По сообщению немецкого информационного агентства ДПА, два представительства "Рейтер" опечатаны. Власти также заставили семерых местных сотрудников агентства подписать обязательство не вступать в контакт с "Рейтер" в течение трех месяцев. Девять сотрудников агентства на западном берегу реки Иордан в свою очередь по телефону получили предостерегающие рекомендации по поводу распространения "ложных сообщений", сообщает агентство.

"Еще одно деяние Робин Гуда"

Как уже сообщала американская газета "Лос Анджелес Таймс", Эрик Клэптон объявил о своем намерении построить реабилитационный центр для алкоголиков и наркоманов. Местом расположения центра выбраны острова Антигуа. Гуманитарный проект рок-звезды в Вест Индии будет копией аналогичного заведения в Палм Спрингс, основательницей которого является Бетти Форд. Клэптон назвал свою инициативу "Еще одним деянием Робин Гуда". В строительство лечебницы под названием "Кроссроудз" (Перекрестки) на сорок больничных коек он вложит более пяти миллионов долларов. Однако, как отмечает газета, благородство тоже имеет пределы. Возможность пользоваться услугами центра за чисто символическую плату получат только местные жители. Всем же приезжим алкоголикам и наркоманам за месячный курс лечения придется выложить порядка десяти тысяч долларов. Любовь музыканта к антигуанцам газета объясняет тем, что он уже владеет парой роскошных домов на архипелаге, да и власти проявили некоторую благосклонность, продав ему участок в 10 акров под строительство "обители" всего за сто тысяч долларов.

Французские женщины не исключают возможности супружеской неверности

Американская газета "Сан-Франциско Кроникл" публикует результаты исследований французских социологов относительно проблемы супружеской неверности. В данном случае наибольший интерес проявляется к женской половине, которая, как известно, отличается весьма затаенным поведением. Отвечая на вопрос "С кем бы вы могли изменить своему мужу?", двадцать пять процентов француженок находят вполне возможным близкие отношения с коллегами по работе. Столько же не исключают подобных отношений с новыми и интересными знакомыми. Около сорока процентов вполне могут впасть в искушение, находясь в отпуске с другом собственного мужа. Остальные сознаются, что не исключают обстоятельств, которые могли бы толкнуть их на столь осудительные действия, пишет газета.

Америка хочет видеть Канаду "единой и сильной"

Государственный Секретарь США Мадлен Олбрайт заявила, что Америка хочет видеть Канаду "единой и сильной", сообщает агентство "Ассошиэйтед Пресс". Олбрайт, которая находится в Канаде с официальным визитом, подтвердила давнюю позицию США по отношению к выходу из состава Канады провинции Квебек. У франкоязычного квебекского большинства очень сильны сепаратистские настроения.

Последний референдум о судьбе Квебека проводился в октябре 1995 года. Тогда сепаратистам для воплощения мечты не хватило 1% голосов. Очередной референдум намечен на осень 1999 года, и активисты движения за независимость Квебека надеются, что их провинция войдет в 3-е тысячелетие независимым государством.

Выход из состава Канады породит ряд новых проблем - доработку военных соглашений с США, вопрос о членстве в НАТО и пересмотр более двухсот международных соглашений. Но выход Квебека из канадской федерации не повлияет на его торговые отношения с США. Американо-канадский товарооборот достигает сегодня 1 миллиарда долларов в день. Квебек может рассчитывать на почетное 8-е место в списке крупнейших торговых партнеров США.

Политическая амнистия в Южной Корее

Президент Южной Кореи Ким Де-Джун объявил об амнистии ряда политических заключенных, сообщает корреспондент британской газеты "Дэйли Телеграф". По информации сеульских групп по защите прав человека, 478 человек отбывают срок за политические убеждения. 23 из них уже отсидели более 28 лет. Амнистии подлежат политзаключенные, которые участвовали в оппозиционных движениях против военного режима прошлых лет, а также те, кто обвинялся в шпионаже в пользу Северной Кореи.

Соединенные Штаты Америки могут лишиться права голоса в ООН

Это случится, если они в ближайшее время не погасят свою задолженность перед международной организацией, сообщает агентство "Ассошиэйтед Пресс". Об этом заявил глава финансовой службы ООН Джозеф Коннор. Вопрос американской задолженности перед ООН станет одной из тем сегодняшней встречи Кофи Аннана с Биллом Клинтоном и членами правительства США. По уставу ООН, страна лишается права голоса, если ее задолженность составляет или превышает уровень взносов предыдущего года.

В настоящее время долг США составляет 1 миллиард 300 миллионов долларов, а его выплата стала дополнительным разногласием между администрацией президента и нижней палатой Конгресса. Республиканское большинство Конгресса требует снижения 25-процентной доли США в бюджете ООН. В прошлом году Сенат одобрил выплату двух третей долга, но проект "зарезала" Палата Представителей, требуя немедленной отмены государственного финансирования клиник, производящих аборты.

Зеркало

Он систематически тащит свою страну назад в советский период

"Крисчен сайенс монитор" (США):

"Он склонен к воспоминаниям о советской эре, восхищается Гитлером, сажает за решетку своих оппонентов и отдалил от себя западные правительства, выгнав послов из их резиденций.

Действительно, президент Александр Лукашенко быстро превратился в международного парию за свое жесткое правление в Беларуси, затиснутой между Россией и Польшей в Восточной Европе.

С тех пор, как он пришел к власти в 1994 году, этот бывший босс государственной фермы систематически тащит свою страну назад в советский период, когда преследовались диссиденты, средства массовой информации душились, а приватизация экономики считалась анафемой.

"Он жаждет власти, — говорит Андрей Сальников, представитель недавно созданной группы в защиту прав человека Хартия-97, базирующейся в Минске. — Атмосфера контроля и боязни здесь такая же, как в Советском Союзе в 70-е годы".

В другом комментарии эта же газета пишет:

"Белорусский президент Александр Лукашенко не скрывает желания воссоединить свою страну с Россией. Это было объявленной им целью с момента прихода к власти. Его помощники говорят, что он питает надежды стать следующим Борисом Ельциным.

Воссоединение в основном — популярная идея среди многих русских, которые лишились мощного Советского Союза в недавнем прошлом. Около 38 процентов россиян желают объединиться в одно государство.

Однако снова склеить две части распавшегося Советского Союза нелегко. Соглашение о союзе, подписанное в 1997 году, не привело к полному слиянию, которое аналитики считают политически и технически сложным для осуществления".

И Беларусь, вероятно, упустила свой шанс.

При нынешнем финансовом кризисе в России Москва вряд ли захочет взять на свой борт слабую, противящуюся реформам экономику. Уже сейчас таможенный союз двух стран является невыгодным для России".

Россия все еще смертоносна, настаивает бывший шпион

"Таймс" (Великобритания):

"Бывший российский шпион, перебежавший в США в 1992 году, утверждает в своей новой книге (вышедшей в Вашингтоне. — **Прим. ред.**), что его родная страна более опасна, чем когда-либо, и что московская мафия вовлечена в новую "холодную войну".

Бывший полковник советской военной разведки — ГРУ — Станислав Лунев заявляет в книге "Глазами врага" (Through the Eyes of the Enemy), что Москва имеет план отравления американской системы водоснабжения; что Россия до сих пор обучает антиамериканских террористов из Ирака, Ирана, Ливии и Сирии и что список лидеров США, намеченных для убийства, все еще существует.

Он утверждает, что два года назад президент Ельцин распорядился, чтобы промышленный шпионаж против американских фирм стал приоритетным для всех российских разведывательных органов.

Однако ключевой идеей книги является утверждение, что мафия контролирует ключевую часть правительства России. После распада Советского Союза, заявляет автор, мафия стала единственной группой с достаточной экономической мощью для покупки приватизируемой государственной собственности, а также части правительства.

Российское посольство в Вашингтоне охарактеризовало утверждения Лунева как нелепые и не подтвержденные фактами".

Компьютер задействован для раскрытия тайны скульптуры Микеланджело

"Таймс" (Великобритания):

"Историки-искусствоведы обратились к компьютерной технологии, чтобы разгадать тайну: почему Микеланджело разбил вдребезги скульптуру, которую он изваял в качестве монумента для своей собственной могилы.

Флорентийская "Пьета", изображающая распятое тело Христа на руках девы Марии, была изваяна Микеланджело из цельного куска мрамора. Великому скульптору эпохи позднего Возрождения тогда было за 70 лет.

Этой работой постоянно восхищались современники в Риме, такие, как Асконио Кондиви, автор книги "Жизнь Микеланджело", написавший в 1553 году: "Невозможно передать ее красоту и скорбь. Достаточно сказать: это редкостная вещь и одно из выдающихся среди когда-либо созданных произведений".

Два года спустя после массовой похвалы "Пьеты" Микеланджело взял молоток и изуродовал произведение, отбив обе руки и левую ногу Христу, левую руку непорочной деве и правую руку Марии Магдалине.

Разбитая скульптурная группа была частично реставрирована малоизвестным зодчим Тиберио Кальканьи, который умер до завершения этой работы. Сегодня в отремонтированной скульптуре, которая находится в музее Опера дель Дуомо во Флоренции, у тела Христа все еще отсутствует нога.

Выходка Микеланджело на протяжении веков вызывает недоумение у историков и деятелей искусства. Некоторые полагают: это произошло из-за того, что треснул мрамор; другие — что Микеланджело был недоволен своей работой, а третьи — что скульптор вошел в раж из-за того, что на него оказывал давление администратор студии, с тем чтобы он быстрее завершил работу.

Американский историк-искусствовед Джек Вассерман решил прибегнуть к помощи компании IBM в поисках более конкретных ответов на этот вопрос. Используя шестилинзовую камеру для съемки 700 многослойных цифровых фотографий, компьютерные специалисты создадут точное трехмерное виртуально-реальное изображение "Пьеты" объемом электронных данных почти в 2 млрд. битов.

Профессор Вассерман надеется, что созданная с помощью компьютеров модель позволит ему исследовать недоступные прежде аспекты. Выступая на пресс-конференции во Флоренции, чтобы объявить об этом проекте, он заявил: "Мы хотим "сместить" те части скульптуры, которые заменил Кальканьи, и тогда мы увидим ее такой, какой видел Микеланджело в день, когда он ее сломал. Это поможет мне лучше представить, для чего он это сделал".

Прекрасный поступок американского миллиардера армянского происхождения

Американский миллиардер армянского происхождения Кирк Киркорян предоставил Армении 100 миллионов долларов на развитие частного предпринимательства в республике.

80-летний американский миллиардер объявил о создании фонда для содействия среднему и малому бизнесу в Армении в сентябре 1997 года на основе средств корпорации Transida и фонда Linci.

Это самое крупное вложение, когда-либо сделанное в армянскую экономику. Деньги поступят в республику поэтапно и будут распределены предприятиям через местные коммерческие банки. Банки получат кредитные средства с 3-процентной годовой ставкой, а предприятия — уже до 15%. Минимальный объем кредита — 100 тысяч долларов, максимальный — 1 миллион.

Ранее К.Киркорян внес значительные суммы в Объединенный армянский фонд, который за 10 лет передал республике гуманитарной и медицинской помощи на сумму свыше 30 млн. долларов.

К.Киркорян и фонд Linci помогали закупать для Армении топливо на 14 млн. долларов во время блокады республики со стороны Азербайджана зимой 1993—1994 года.

Фонд Linci также выделил 4,7 млн. долларов во время телемарафона, организованного Всеармянским фондом "Айастан" для строительства дороги, соединяющей Армению и Нагорный Карабах.

К.Киркорян является владельцем знаменитой кинокомпании "Metro Goldwin Mayer Inc", отеля-казино MGM Grand в Лас-Вегасе, ему принадлежит 14% акций автомобильной компании Kraisler и других крупных предприятий.

Погляд

Якія рэформы патрэбны Беларусі

Калі вялікі рэфарматар Сталыпін праводзіў свае рэформы ў Расійскай імперыі, то мэта была адна — зрабіць яе самай моцнай дзяржавай свету. Але ж і бальшавікі таго ж хацелі, праводзячы свае рэформы — абагульненне сродкаў вытворчасці і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Сталыпіну не далі давесці свае рэформы да канца, а бальшавікі правялі свае рэформы ў поўным аб'ёме. І тым не менш вынік гэтых рэформ — развал Расійскай імперыі.

Цяпер Беларусь стаіць перад дылемай: быць ці не быць рэформам (прычым маюцца на ўвазе рэформы, падобныя да сталыпінскіх), таму што бальшавіцкія рэформы, як было сказана, праведзены ў поўным аб'ёме і вынік іх несуцяшальны. Другімі словамі, калі ўжо і праводзіць рэформы, дык такія, у выніку якіх Беларусь стане эканамічна моцнай і самастойнай дзяржавай.

Але не ўсім да спадобы такі варыянт рашэння. Што датычыць нашых суседніх дзяржаў, то Захад — за рэформы ў Беларусі. І не проста "за", але і настойліва "за": Захад абяцае фінансавую падтрымку Беларусі толькі ў тым выпадку, калі ў нас будуць праводзіцца рэформы. Што ж датычыць Усходу... Па ўсіх паказчыках Расія не зацікаўлена, каб Беларусь была эканамічна моцнай і самастойнай дзяржавай. Вось чаму рэформы ў нас "не ідуць" (назіраецца моцны ўплыў Расіі на наша кіраўніцтва).

Дарэчы, тут адразу ж узнікае пытанне: а якая справа Захаду да нас і да нашых рэформ? Справа ў тым, што бедная, жабрацкая Беларусь уяўляе пагрозу Захаду — бедная краіна заўсёды агрэсіўная. Багаты і забяспечаны Захад хоча, каб яго суседкай з Усходу была багатая і забяспечаная еўрапейская дзяржава. У той жа час Расія не хоча, каб багатая,забяспечаная Еўропа ўшчыльную прыблізілася да яе граніц. Яна хоча, каб агрэсіўная, жабрацкая, бедная Беларусь у якасці буфернай дзяржавы стаяла паміж багатым, забяспечаным Захадам і Расіяй.

Тут неабходна адзначыць, што не толькі Расія не зацікаўлена ў правядзенні рэформ на Беларусі. Не зацікаўлены таксама і мясцовыя гультаі, лайдакі і абібокі. А чаму? Ім жа тады не будзе магчымасці "лавіць рыбку ў мутнай вадзе". Будзе яскрава відаць: хто лайдак, а хто працаўнік.

А ў чым сутнасць рэформ у Беларусі? А сутнасць рэформ у тым, што трэба пазбавіцца ад наступстваў бальшавіцкіх прынцыпаў.

Яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя галоўны тэарэтык анархізму і галоўны апанент Карла Маркса — М.А.Бакунін прадугледзеў крах марксісцкай тэорыі, узятай на ўзбраенне бальшавікамі. Тут, прачытаўшы слова "анархіст", чытач, магчыма, падумае: куды ж гэта аўтар хіліць размову? Анархія ж — гэта хаос! Так, у былога савецкага чалавека словы "анархія", "анархізм" асацыіраваліся са словамі "хаос", "беспарадак". Гэта вынік бальшавіцкай прапаганды: бальшавікі ўмелі ашэльмаваць сваіх ідэалагічных праціўнікаў. На самай жа справе анархізм ставіць сваёй мэтай вызваленне чалавека ад насілля ўсякай улады: і палітычнай, і эканамічнай, і духоўнай. Па сённяшнім меркам анархісты — барацьбіты за правы чалавека. (Дарэчы, анархізм — таксама сацыялізм, толькі, у адрозненне ад бальшавізма, другой канцэпцыі.)

Дык вось, Бакунін яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя прадбачыў, што бальшавіцкая тэорыя, прадугледжваючая абагульненне сродкаў вытворчасці, а таксама скіданне ўсяго грамадскага заробку ў агульны кацёл, а затым размеркаванне яго паміж працоўнымі, пацерпіць крах. Бакунін прадбачыў, што для такога размеркавання будзе неабходна трымаць цэлую армію чыноўнікаў, якія з агульнага катла возьмуць у першую чаргу сабе, а працоўным — што застанецца. А каб працоўныя пікнуць не пасмелі, бачачы, што іх падманваюць, Бакунін прадугледжваў, што будзе аграмадны штат усякіх сілавых структур. А вось гэта ўсё не будзе садзейнічаць падняццю прадукцыйнасці працы: людзі не будуць старанна працаваць амаль "за так".

Як бачым, яно так і выйшла. І не тры "белавежскія зубры" развалілі Савецкі Саюз, а развалілі яго бальшавіцкія эканамічныя рэформы.

Цяпер трэба пазбавіцца ад наступстваў бальшавіцкіх эканамічных рэформ. А як?! Трэба правесці раздзяржаўленне сродкаў вытворчасці, аддаць народу тое, што забралі ў яго ў свой час.

Прабальшавіцкае кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь як быццам ужо правяло прыватызацыю, але беларускі народ не адчуў яе: як быццам яе і не было! І сапраўды: гэта быў блеф, а не прыватызацыя!

Прыватызацыю, ці раздзяржаўленне сродкаў вытворчасці, трэба правесці не для таго, каб паказаць гэта міжнароднай грамадскасці. Прыватызацыю трэба правесці для таго, каб павялічылася прадукцыйнасць працы, каб беларускі народ стаў жыць заможна, як у цывілізаваных еўрапейскіх дзяржавах.

Некаторыя гавораць, што зямлю трэба падзяліць паміж усімі грамадзянамі Беларусі пароўну. Але ж прыватызацыі падлягаюць яшчэ і фабрыкі, і заводы, гандлёвыя прадпрыемствы і шмат іншага. Дык што, іх таксама пароўну?! А ці не будзе гэта падобна на тое, як дзялілі пароўну два неразумныя браты бацькаву спадчыну: раздзялілі ўсё пароўну — разрэзалі напалам жывёлу, птушак, інвентар, пабудовы...

Безумоўна, пасля такой дзялёжкі (калі раздзяліць пароўну зямлю, раздзяліць пароўну фабрыкі і заводы, раздзяліць пароўну гандлёвыя прадпрыемствы) беларускі народ лепш жыць не стане, а стане жыць яшчэ горш. Не! Зямлю трэба даць тым, хто ўмее і жадае працаваць на ёй, фабрыкі і заводы трэба даць тым, хто ўмее і жадае працаваць у прамысловасці, а гандлёвыя прадпрыемствы трэба даць тым, хто ўмее і жадае працаваць у гандлі. Другімі словамі, трэба зрабіць так, каб прыватызаваная дзяржмаёмасць мела большую аддачу, чым да прыватызацыі, а гэта ў сваю чаргу падыме жыццёвы ўзровень насельніцтва, палепшыць яго дабрабыт.

Трэба адзначыць, што такі метад прыватызацыі, які прымяняўся ў Расіі (ваўчары) і ў Беларусі (чэкі), — недасканалы. Пры такім метадзе бедныя становяцца яшчэ бяднейшымі, а багатыя яшчэ багацейшымі. Трэба дзяржмаёмасць размеркаваць так, каб грамадзянам Рэспублікі Беларусь дасталося пароўну (прытым пароўну не зямлі, а менавіта дзяржмаёмасці). Прытым усім грамадзянам, нягледзячы на ўзрост, працоўны стаж, заслугі перад дзяржавай.

"Ах, гэта несправядліва", — запярэчыць хтосьці. Хтосьці скажа, што ён ваяваў, удзельнік ВАВ, другі скажа, што ў яго вялікі працоўны стаж. "А нам тое ж самае, што і немаўлятку. Гэта ж несправядліва!" — скажуць яны разам. А давайце разбяромся, паважаныя спадары. Вы ваявалі? Так! А за што Вы ваявалі? За свабоду і незалежнасць Беларусі? Не! Пасля вайны Беларусь з залежнасці ад Германскай імперыі перайшла ў залежнасць ад Расійскай імперыі. А мэта любога паважаючага сябе народа — дабіцца свабоды і незалежнасці! Вы — удзельнікі ВАВ — не дабіліся свабоды і незалежнасці для Беларусі. А хто яе будзе дабівацца? Яны — цяперашнія немаўляткі і малалеткі! Дык за што Вам прывілеі і за што іх будзем абдзяляць?!

Тое ж самае і з працоўным стажам. Вы, якія са стажам, дабіліся эканамічнай магутнасці Беларусі? Як бачым, не! Дык за што ж вам прывілеі? За работу вам ішла зарплата, прэміі і г.д. А дабівацца эканамічнай магутнасці Беларусі будуць яны — цяперашнія немаўляткі, малалеткі. Акрамя таго, гэтыя немаўляткі і малалеткі — нашыя дзеці і ўнукі! Значыцца, самае справядлівае будзе — усім аднолькава! Гэтым мы праявім клопат аб нашай будучыні. Кебічаўская ж прыватызацыя — гэта погляд у мінулае і абыякавасць да нашай будучыні.

Такім чынам, мы высветлілі, што дзяржмаёмасць, якая падлягае прыватызацыі, трэба раздзяліць пароўну паміж усімі грамадзянамі Беларусі, нягледзячы на пол, узрост, працоўны стаж і заслугі перад дзяржавай.

Цяпер паразважаем, як гэта зрабіць. Мяркую, што спачатку трэба перавесці ўсю дзяржмаёмасць у грашовы эквівалент, затым узяць 50 працэнтаў той сумы (звычайна прыватызуецца каля 50 працэнтаў дзяржмаёмасці) і раздзяліць яе на колькасць грамадзян Беларусі (гэта каля 10 мільёнаў). Павінна атрымацца, як лічаць эканамісты, дзесьці каля 50 тысяч долараў.

Уявім сабе, што дзяржструктуры зрабілі гэтую работу, і ў сховішчах Нацыянальнага банка Беларусі ўжо знаходзіцца каля дзесяці мільёнаў імянных прыватызацыйных чэкаў коштам 50 тысяч долараў кожны. Застаецца толькі ўпісаць прозвішча, імя і імя па бацьку ў гэтыя чэкі. Але ж трэба ўлічваць, што склад насельніцтва пастаянна змяняецца — адны нараджаюцца, другія паміраюць... Каб было па справядлівасці, лічу, што трэба назначыць дзень прыватызацыі і ўсім, хто жыў у гэты дзень, выпісаць па чэку. Прычым і тым, хто нарадзіўся ў гэты дзень, і тым, хто памёр у гэты дзень, таму што яны ўсё ж хоць трохі, але жылі ў гэты дзень (дзень лічыцца з 00 гадзін да 24 гадзін).

Цяпер уявім сабе, што кожны грамадзянін Беларусі ўжо мае індывідуальны прыватызацыйны чэк коштам 50 тысяч долараў. Прадаваць яго нельга. На яго толькі можна набываць дзяржмаёмасць, якая падлягае прыватызацыі. Але я лічу, што трэба было б пад залог гэтых чэкаў даць магчымасць грамадзянам браць мэтанакіраваны крэдыт у банках. Гэта дало б магчымасць нават бамжу стаць паўнацэнным грамадзянінам Беларусі: ён мог бы ўзяць крэдыт пад залог чэка на пакупку кватэры, а затым уладкавацца на работу.

А цяпер уявім сабе, што грамадзяне набылі дзяржмаёмасць за прыватызацыйныя чэкі: акцыі заводаў і фабрык, гандлёвых прадпрыемстваў, надзелы зямлі... Дык што, даць ім магчымасць гандляваць акцыямі, зямлёй? Мне здаецца, што так рабіць не варта, таму што ў людзей няма яшчэ адчування гаспадара і яны могуць нарабіць шмат памылак. Не трэба адразу ўключаць рычагі рыначных адносін, таму што, па-першае, многія грамадзяне Беларусі яшчэ не змогуць прыняць удзел у прыватызацыі з-за свайго ўзросту, а ў фермераў не будзе ніякай эканамічнай базы — ні тэхнікі, ні інвентара, ні вытворчых пабудоў. У выніку гэтага ў краіне ўзнікне пераходны перыяд, калі вытворчасць яшчэ больш знізіцца. Не! Прыватызацыю трэба правесці разумна, каб вытворчасць не звужалася. Няхай рабочыя, ІТР набудуць акцыі свайго завода, але пакуль што завод пабудзе на захаванні ў дзяржавы. Няхай калгаснікі набудуць надзелы зямлі, але няхай пакуль што гэтая зямля пабудзе на захаванні ў дзяржавы (пакуль што ёю будуць карыстацца калгасы і саўгасы).

У заходніх краінах працэс прыватызацыі доўжыўся 18—20 гадоў. Не трэба спяшацца і нам. Каб стаць гаспадаром, трэба падрыхтавацца і маральна, і матэрыяльна. А гэта не робіцца раптоўна. 18 гадоў на гэта, мяркую, хопіць. Ды і немаўляткі падрастуць к таму часу. Можна будзе адначасова для ўсіх грамадзян уключыць рычагі рынкавых адносін: грамадзянам можна будзе ўдзельнічаць у размеркаванні прыбытку на прадпрыемствах, набываць ці прадаваць акцыі, можна будзе набываць ці прадаваць зямлю, а можна і працаваць на ёй. Грамадзяне к таму часу ўжо набудуць самасвядомасць уласніка і не наробяць памылак (не спусцяць свой надзел ці акцыі за скрынку водкі). Каб зямля ці заводы не ўплылі за мяжу, можна будзе прыняць закон, які забароніць гандляваць прыватызаванай дзяржмаёмасцю з грамадзянамі замежных краін.

Вось так, калі зямля, заводы, фабрыкі, гандлёвыя прадпрыемствы набудуць гаспадароў, прадукцыйнасць працы павысіцца, жыццёвы ўзровень насельніцтва падымецца, эканамічная магутнасць дзяржавы ўзрасце.

А самае галоўнае, што народ, які займее ўласнасць, ужо не будзе такі залежны ад кіраўніцтва, займее гонар і годнасць, і ніхто не пасмее папіхаць яго, як гэта робіцца цяпер.

Вось такія, лічу, рэформы патрэбны беларускаму народу.

Яўген ФІЛІПОВІЧ,
Мінскі раён.

Судьба человека

Последний обитатель специнтерната №2

Судьба "шпионки" Ольги Буковской

Бывшие белогвардейские генералы, колчаковские офицеры, русские аристократы и сотрудники немецких СС жили и умерли в небольшом поселке Большие Березинки в стенах здешнего дома-интерната. Дворянка Ольга Александровна Буковская — последняя из них, дожившая до сегодняшнего дня...

Два года назад ее пригласили в кабинет директора. Перед тем как зачитать содержание документа, Раиса Макаркина, директор интерната, обняла пожилую женщину, поняв, что от волнения Буковская может упасть.

— Дорогая Ольга Александровна, поздравляю вас — пришла справка о вашей реабилитации. В общем... вы не виновны...

Буковская заплакала: "Наконец-то! Я знала, что правда когда-нибудь восторжествует..." Ей было предложено выехать в любую точку страны, но она осталась жить в доме-интернате, а справку о реабилитации отдала для начисления пенсии: на 86-м году жизни место жительства уже не меняют... Ей кажется, что теперь она будет, как все, и эта мысль ее успокаивает — роман жизни ее близится к завершению...

...В далеком детстве друг отца — англичанин, увлекающийся модной тогда астрологией, составил маленькой Оле Буковской гороскоп: тяжелая жизнь, частые болезни, возвращение на родину против воли и венчающая все насильственная смерть. Сейчас она часто вспоминает свое детство и тот гороскоп, из-за которого отец чуть не поссорился с другом.

Ее отец, полковник Александр Петрович Буковской, командовал стрелковым полком, расквартированным в Царском Селе. Льву Троцкому, предложившему службу в Красной гвардии и командование целой дивизией, он резко ответил, что присягу дважды не принимают, после чего спешно пришлось эмигрировать, оставив жену, баронессу Марию Корф, и дочь Олю девяти лет в Петрограде. Только через три с лишним года, когда Александру Буковскому удалось обустроиться за границей, он смог организовать нелегальный вывоз семьи к себе в Югославию. Как-то Оля пришла домой из школы-интерната для детей рабочих и застала странных людей с поднятыми воротниками. Финны-контрабандисты, раньше промышлявшие сахаром, спиртным и оружием, после переворота нашли более выгодное занятие: они переправляли за границу бывших дворян. Февральской ночью 1920-го, погрузившись на сани, мать и дочь приехали в Новую Ладогу. Лед Финского залива уже таял, поэтому, когда подъезжали к финской границе, под ногами лошадей хлюпала вода. Ольга, хоть и была уже "взрослой девочкой", взяла в дальнюю поездку куклу и мячик, крепко сжимая их в руках...

